Грамадства У цэнтры ўвагі

Абавязковае патрабаванне – валоданне мовай спагады. 5 студзеня — Дзень работнікаў сацыяльнай абароны

05/01/2018 283 redakcyja 0 Comment

Пра чуласць і міласэрнасць можна доўга разважаць, натхняцца прыгожымі ўчынкамі, а вось прымераць на сябе гэту зусім не простую ролю па сілах не кожнаму. Толькі людзям з выключнай душэўнасцю і шчырасцю, уменнем суперажываць і адчуваць боль іншага. Усё гэта ўласціва сацыяльным работнікам. Яны дапамагаюць нашым землякам справіцца з адзіноцтвам, імкнуцца зрабіць іх жыццё больш зручным і ўтульным. Службай даверу, міласэрнасці і дабра называюць сацыяльную абарону. Звяртаецца сюды, вобразна кажучы, сёння ці заўтра кожны. Прызначэнне і выплата пенсій, садзеянне ў працаўладкаванні, аказанне матэрыяльнай дапамогі – гэтыя і многія іншыя пытанні штодня добрасумленна і адказна вырашаюць супрацоўнікі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама.

Начальнік упраўлення Леанід Калбаса перакананы: менавіта чуласць сацработнікаў у спалучэнні з дакладнасцю, абавязковасцю,





аператыўнасцю і, канешне, нераўнадушнасцю з’яўляюцца тымі спадарожнікамі, якія дапамагаюць яго калегам стаць незаменнымі для многіх землякоў. У службовых інструкцыях няма патрабавання «спагадлівасць», але менавіта спагадлівасць прысутнічае ў іх стасунках заўсёды.

Пра гэтае і многае іншае напярэдадні прафесійнага свята – Дня работнікаў сацыяльнай абароны – расказаў карэспандэнту «ЛВ» Леанід КАЛБАСА.



– Леанід Іосіфавіч, адным з важных накірункаў работы вашай службы з’яўляецца сацыяльная дапамога. Дзяржаўная падтрымка для чалавека ў складанай жыццёвай сітуацыі – вельмі важкая і дарэчная.

– Сапраўды, з кола шматлікіх пытанняў, якія вырашае і каардынуе ўпраўленне, сацыяльная дапамога – адно з надзённых. За кожным адрасам – лёс чалавека, яго праблемы. Яны, безумоўна, патрабуюць неказённай увагі, шчырай зацікаўленасці. Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога за мінулы год назначана 1037 нашым землякам на агульную суму 262541 рубель. Яе атрымальнікі –
маламаёмныя грамадзяне і сем’і, а таксама тыя, хто трапіў у складаную жыццёвую сітуацыю.

73 дзіцяці да двухгадовага ўзросту бясплатна забяспечваліся прадуктамі харчавання. Нашы землякі атрымлівалі дапамогу на аплату тэхнічных сродкаў рэабілітацыі, набыццё падгузнікаў. З фонду сацыяльнай абароны насельніцтва пажылым грамадзянам выдзяляліся сродкі для набыцця паліва, дарагіх лякарстваў і на іншыя патрэбы. Адзінокім пажылым грамадзянам і інвалідам устанаўліваліся аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, рамантаваліся печы і электраправодка.

Наогул, у сацыяльную службу насельніцтва звяртаецца за рознага роду дапамогай. Ніхто не застаецца невыслуханым і непачутым.

– Здаецца, зусім нядаўна пачалі ствараццa тэрытарыяльныя цэнт-ры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Сёння зразумела, што гэтыя









«ШКОЛЬНЫ ДЗЁННІК»



РЭКЛАМА

падраздзяленні надзвычай запатрабаваныя. А чым можа пахваліцца наш ТЦСАН?

– ТЦСАН – гэта шэсць разнапланавых аддзяленняў, дзейнасць якіх накіравана на комплекснае сацыяльнае абслугоўванне грамадзян, якім патрабуецца дапамога. Аддзяленне дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту сёлета справіла наваселле: размясцілася на першым паверсе арэнднага дома ў цэнтры Ляхавіч. Яго наведваюць 38 маладых душой і нераўнадушных да жыцця землякоў узростам ад 60 гадоў і старэйшых. Тут, як дома: утульна і камфортна, а яшчэ вельмі светла і цёпла ад асаблівай энергетыкі падапечных. Працуюць гурткі, ладзяцца святы і сустрэчы – адзіноцтву і суму месца няма. Нядаўна на базе аддзялення стаў працаваць універсітэт трэцяга ўзросту, у які залічана 60 «студэнтаў». Да іх паслуг факультэты па вывучэнні замежных моў, камп'ютарных інфармацыйных тэхналогій і дадатковай адукацыі (саломапляценне, псіхалогія, краязнаўства і г.д.).

У аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў абмежаваныя магчымасці нашых землякоў становяцца, у прамым сэнсе, неабмежаванымі. У рэабілітацыйна-працоўнай майстэрні падапечныя аддзялення ствараюць прыгожыя і арыгінальныя сувеніры, якія карыстаюцца попытам у пакупнікоў арганізаванага тут сацыяльнага магазіна. Для інвалідаў аддзяленне стала другім домам, дзе іх чакаюць і разумеюць.

Наш раён два з паловай гады назад стаў першым у вобласці, дзе адкрыўся дом сумеснага пражывання для грамадзян пажылога ўзросту. Былы дзіцячы сад у Ганчарах пасля рамонту стаў для адных утульным домам, для іншых – надзейным прытулкам на халодныя месяцы года. Зараз тут жывуць 11 чалавек.

– Якія формы работы з насельніцтвам прыжыліся яшчэ ў нашым раёне?

– Востраўскі, Завінскі, Стральцоўскі, Гутаўскі сацыяльныя пункты, дзве мабільныя брыгады – сацыяльная падтрымка даступная насельніцтву нават у самых аддаленых кропках раёна. Укаранёны інавацыйныя формы сацабслугоўвання – прыёмныя сем'і, гасцявыя, патранатныя. Напрыклад, у гасцявых сем'ях у Падлессі, Дамашах і Куршынавічах тры адзінокія вяскоўцы ў святы і выхадныя дні становяцца сваімі ў чужых людзей.

– Сацыяльныя паслугі развіваюцца і ўдасканальваюцца дзеля зручнасці тых, каму без іх даводзіцца цяжка.

– Чалавек у складанай жыццёвай сітуацыі не павінен заставацца сам-насам з праблемай. Штодня сацыяльныя работнікі, супрацоўнікі ўпраўлення дапамагаюць людзям. З лютага 2017 года медыцынскія сёстры міласэрнасці ад раённай арганізацыі таварыства Чырвонага Крыжа бясплатна аказваюць медыка-сацыяльныя паслугі 28 адзінока пражываючым грамадзянам старэйшым за 60 гадоў, у тым ліку інвалідам I і II груп.

У аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў існуе платная сацыяльная паслуга – «гасцініца выхаднога дня», якая дае магчымасць бацькам ці членам сям'і інвалідаў атрымаць некаторы вольны час, вырашыць сацыяльна-бытавыя пытанні ці проста адпачыць.

У ТЦСАН можна аформіць платную паслугу сядзелкі. Нават такія дробязі, як







Видеоканал "Ляховичи и ляховичане". События, люди, мнения





стрыжка па нізкіх, так званых сацыяльных цэнах, для пенсіянераў, інвалідаў I і II груп становіцца слушнай падтрымкай. Магчымасцю бясплатна ўзяць напракат тэхнічныя сродкі сацыяльнай рэабілітацыі з пачатку года скарыстаўся 51 чалавек. Да дабрачынных акцый імкнёмся далучыць сваіх землякоў. Напрыклад, акцыя «Сям'я – сям'і» дапамагла многім малазабяспечаным грамадзянам набыць неабходныя для іх рэчы, адзенне. Наогул, звярнуўшыся на тэлефон гарачай лініі цэнтра можна расказаць пра свае цяжкасці і праблемы. Спецыялісты абавязкова адрэагуюць на званок, дадуць параду. А для ахвяр сямейнага насілля адкрыты крызісны пакой, дзе створаны неабходныя ўмовы для часовага пражывання, ёсць магчымасць атрымаць і экстранную сацыяльна-псіхалагічную, юрыдычную і іншую дапамогу.

– Сацыяльны работнік часта становіцца для чужых людзей амаль родным. А быць патрэбным іншым – работа няпростая. Як з ёй спраўляюцца сацыяльныя работнікі нашага раёна?

– Сацыяльны работнік – незаменны памочнік для адзінокіх людзей. На надомным абслугоўванні знаходзіцца 584 пажылыя землякі ў 76 населеных пунктах раёна. Да сваіх падапечных у любое надвор'е, часам за дзясятак кіламетраў, спяшаюцца 75 сацыяльных работнікаў. Для многіх з іх прафесія стала прызваннем, справай жыцця. Часам нават родныя не могуць знайсці агульнай мовы адзін з адным, а тут неабходна дагадзіць чужому чалавеку. Не толькі прыбраць, распаліць печку ці іншую работу зрабіць, а і пагаварыць па душах. Выпадковыя ў нашай прафесіі не затрымліваюцца. Многія з работнікаў не абмяжоўваюцца працоўным часам – са сваімі бабулямі-дзядулямі на сувязі пастаянна. Сярод лепшых сацработнікаў, для каго падапечныя не шкадуюць самых шчырых слоў удзячнасці, – Наталля Лашук, Раіса Горбік, Сафія Кумейша, Валянціна Касабуцкая, Людміла Ігнатовіч, Марыя Шульц. На нядаўнім раённым конкурсе прафесійнага майстэрства лепшай была прызнана Вольга Горбік.

– Вялікая сям'я сёння – актуальна і модна. У першую чаргу гэта абумоўлена дзяржаўнай падтрымкай, у тым ліку такім яе відам як сямейны капітал.

– У раёне па стане на канец мінулага года 375 сем'яў выхоўваюць тры і больш дзяцей і маюць статус мнагадзетных. У дзевятнаццаці сем'ях – пяць і больш рабят.

Сямейны капітал, без перабольшання, падтрымаў жаданне многіх сем'яў падрасці. Летась упраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама гэтую дзяржаўную дапамогу назначыла 69 сем'ям, у якіх нарадзілася трэцяе ці наступнае дзіця. А ўсяго з моманту падпісання ўказа з 1 студзеня 2015 года – 173 мнагадзетным сем'ям.

Радуе, што вялікая сям'я становіцца цудоўнай традыцыяй. Жыццесцвярджальны дэмаграфічны факт.

Гутарыла Наталля ПЕРАПЕЧКА.



Президент Республики Беларусь

БРЕСТСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

ЛЯХОВИЧСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

НАШИ ЦЕЛИ

ЦЕЛИ УСТОЙЧИВОГО РАЗВИТИЯ В БЕЛАРУСИ

У аддзела рэкламы «ЛВ» новы нумар тэлефона 6 09 08

Навіны БелТА

Опросы



← Кадэты ў кімано адзеты

Проста ас! Вастраўчанін Мікалай Зубік у сваёй справе – сапраўдны прафесіянал →

Вам также понравится



Четвертая партия медицинского груза для Беларуси отправлена из Китая

31/05/2020 0

Залікі і пралікі. Адно з пытанняў, якое выносілася на разгляд чарговага пасяджэння райвыканкама, – вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця раёна і выкананне бюджэту за 2018 год

01/03/2019 0



«Что в результате?» Александр Лукашенко на совещании по зимним видам спорта потребовал ответить на главный вопрос

24/03/2022 0

Добавить комментарий

Ваш e-mail не будет опубликован. Обязательные поля помечены *

Комментарий

Достаточно ли озеленён город? Устраивает ли качество городского озеленения?

- ☐ да, озеленён достаточно, посадки ухожены
- ☐ да, озеленён достаточно, но посадки недостаточно ухожены
- ☐ нет, озеленён недостаточно, но посадки ухожены
- ☐ нет, озеленён недостаточно, посадки недостаточно ухожены

Голос

Просмотреть результаты

Каких видов зелёных насаждений, на ваш взгляд, не хватает в городе?

- ☐ газонов
- ☐ цветников и клумб
- ☐ кустарников
- ☐ деревьев
- ☐ ваш вариант

Голос

Просмотреть результаты

Вы готовы принять участие в благоустройстве и озеленении города?

- ☐ да
- ☐ нет
- ☐ не знаю/ затрудняюсь ответить

Имя *

E-mail *

Сайт

Отправить комментарий

Голос

Просмотреть результаты

Ляхавіцкі край вачамі патэнцыяльнага турыста



Наш архіў

Выберите месяц

Рубрыкі сайта

Выберите рубрику

Урачэбная кансультацыя



Каляндар

Апрель 2024

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб
« Мар					

Пн	Вт	Ср	Чт	Пт	Сб
1	2	3	4	5	6
8	9	10	11	12	13
15	16	17	18	19	20
22	23	24	25	26	27
29	30				
« Мар					











Каментарыі

Елена к записи «Ляхавіцкі веснік» аб’явіў конкурс, дзе ў галоўнай ролі — … ведзьмачка

Елена к записи У саюзе з друкам. Гэтымі днямі Белсаюздрук адзначае стогадовы юбілей

Читать и ещё раз читать к записи Яркі падарунак



Надвор`е ў Ляхавічах



+6 +10 +9
Gismeteo Прогно

Ляхавічы на карце



Карта сайта

Галоўная

РУБРЫКІ

- У цэнтры ўвагі
- Единый день голосования
- Навіны
- Грамадства
- Памяць сэрца
- Калонка рэдактара. Думкі ўслых
- Сельская гаспадарка
- Тэма тыдня
- Спорт
- Культура
- Адукацыя
- Служба 101
- ДАІ інфармуе
- Здарэнні

При перепечатке материалов гиперссылка на сайт http://www.lves.by/ обязательна
Копирайт © 2024 Ляховичи. Ляховичский вестник. Ляхавіцкі веснік. Новости города Ляховичи Брестской области. Все права защищены.

Рейтинг@Mail.ru